Нашы дзеці

НЯХАЙ ЖАДАННІ СПРАЎДЗЯЦЦА

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС учора наведаў школу-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў у Радашковічах і прывёз выхаванцам падарункі.

Ад імя ўрада прэм'ер уручыў дзецям сертыфікат на монаблок і салодкія гасцінцы. Да віншаванняў далучылася і Беларуская федэрацыя футбола, яе прадстаўнікі падарылі дзецям прафесійныя футбольныя мячы. Ад Мінаблвыканкама дзеці атрымалі ў падарунак сертыфікат на бегавую дарожку.

У Радашковіцкай школе-інтэрнаце выхоўваюцца і навучаюцца 118 дзяцей. Прэм'ер-міністр азнаёміўся з матэрыяльна-тэхнічнай і спартыўнай базай школы, наведаў музей паветраных і вогненных таранаў і краязнаўчы музей.

Дзеці таксама зрабілі падарунак кіраўніку ўрада — карціну, зробленую сваімі рукамі. Прэм'ер падзякаваў за падарунак і пажадаў дзецям, каб здзейсніліся іх запаветныя жаданні.

— Няхай надыходзячы 2019 год будзе такім, якім вы самі яго зробіце для сябе, — сказаў Сяргей Румас. — Жадаю вам больш упэўненасці ў сваіх сілах, добра вучыцца, займацца музыкай і спортам, каб у выніку вы выраслі дастойнымі грамадзянамі нашай краіны.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, у Беларусі робіцца ўсё магчымае для дзяцей.

«Толькі ў гэтым годзе дзяржава ўвяла ў эксплуатацыю тры новыя школы, 14 дзіцячых дамоў і адрамантавала вялікую колькасць навучальных устаноў», — адзначыў прэм'ер.

Сяргей Румас расказаў, што на Новы год і Каляды многія кіраўнікі краіны выязджаюць у навучальныя ўстановы і дзіцячыя дамы, каб падарыць дзецям часцінку цяпла і разам з імі сустрэць гэтыя светлыя святы.

Паводле БелТА.

Фота БелТА.

ПАДАРУНКІ І ДЫСКАТЭКА

Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка напярэдадні навагодніх і калядных свят наведаў падшэфную Чэхаўшчынскую дапаможную школу-інтэрнат.

Уладзімір Вашчанка павіншаваў выхаванцаў і педагогаў з надыходзячымі навагоднімі і калядныя святамі. Усе вучні школы атрымалі падарункі. Яны падрыхтавалі для ратавальнікоў адмысловае выступленне. Курсанты Універсітэта грамадзянскай абароны МНС у даўгу не засталіся і ў сваю чаргу наладзілі святочную дыскатэку. Міністэрства па надзвычайных сітуацыях даўно ўзяло шэфства над школай-інтэрнатам. За гэты час яно дапамагло адрамантаваць будынак школы, уладкаваць вучэбныя памяшканні, камп'ютарны клас і спартыўную залу.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ЦІР І НЕ ТОЛЬКІ!

У Андрэеўскім дзіцячым доме Аршанскага раёна ўчора, 21 снежня, у рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» пабываў міністр абароны Беларусі Андрэй РАЎКОЎ.

Фота Міністэрства абароны.

Павіншаваць з Калядамі і навагоднім святам — гэта ўжо традыцыя, бо больш чым дзесяць гадоў кіраўнік абароннага ведамства прыязджае ў гэтую сацыяльна-педагагічную ўстанову, дзе жывуць больш за сорак дзяцей і падлеткаў ва ўзросце ад 7 да 17 гадоў. У міністэрстве імкнуцца зрабіць усё магчымае, каб ва ўстанове былі ўмовы пражывання, максімальна набліжаныя да хатніх. Для гэтага робіцца рамонт, набываюцца мэбля, тэхнічнае і спартыўнае абсталяванне. Для выхаванцаў арганізуюцца экскурсіі. Напрыклад, дзяўчаткі і хлопчыкі ездзілі ў Мінск, каб наведаць Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, драматычны тэатр беларускай арміі, цырк. Вазілі і на гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна».

Сёлета падарунак ад ваеннага ведамства — інтэрактыўны цір (ці, інакш, электронны стралковы лазерны трэнажор) і дзевяць камп'ютараў.

Андрэй Раўкоў пацікавіўся ў дзяцей, як яны вучыліся, шчыра пажадаў ім, каб збываліся іх мары. Звярнуў увагу, што, каб абараняць Радзіму, трэба быць здаровымі, а для гэтага набходна займацца спортам. Каб чагосьці дасягнуць у жыцці, трэба атрымаць адукацыю, спецыяльнасць, шмат працаваць.

Выхаванцы падаравалі гасцям цікавую творчую праграму, якую падрыхтавалі самі.

Адказваючы на пытанні прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, міністр абароны Беларусі Андрэй Раўкоў адзначыў, што рады быць тут:

— Дзеці вераць у цуды, якія адбываюццца на навагоднія святы, таму мы імкнёмся рабіць так, каб некаторыя мары ажыццяўляліся. На жаль, замяніць бацькоў мы ім не можам. Але, каб яны годна жылі тут, развіваліся, вучыліся ва ўмовах, якія адпавядаюць патрабаванням часу, робім многае.

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны, у гэтыя дні ў рамках акцыі «Нашы дзеці» курсанты, ваеннаслужачыя наведваюць дзіцячыя дамы, школы-інтэрнаты, дзіцячыя бальніцы, прыёмныя і апякунскія сем'і.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Добрая навіна

ДОМ ДЛЯ ШЧАСЦЯ І РАДАСЦІ

Два дзіцячыя дамы сямейнага тыпу адкрыюцца адначасова на Гомельшчыне. 26 снежня сем'і Логвінавых з Ельска і Аніскаўцоў са Жлобіна будуць прымаць падарункі і ўрачыста адзначаць улазіны.

Абодва дамы пабудаваны на парытэтных пачатках рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. Выдаткі на будаўніцтва кожнага склалі 350—370 тысяч рублёў.

У Ельску бацькамі-выхавальнікамі стануць сужэнцы Наталля і Дзмітрый Логвінавы. Яшчэ да гэтага важнага моманту яны ўсынавілі пяцярых дзяцей, малодшай — усяго год. З імі разам будуць жыць і яшчэ трое дзетак, якія засталіся без бацькоўскай апекі.

У Жлобіне бацькі-выхавальнікі Таццяна і Міхаіл Аніскаўцы маюць сваіх двух дзяцей, якія ўжо вучацца ў каледжах. Галасы яшчэ пяці хлопчыкаў і дзяўчатак напоўняць шчасцем і клопатамі новы ўтульны будынак.

На Гомельшчыне сёння больш за 80 % дзяцей-сірот і дзяцей, пакінутых без апекі бацькоў, выхоўваюцца ў сем'ях, якія замянілі малым біялагічных бацькоў. Зараз у вобласці 46 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. У іх пражывае 283 дзіцяці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцк-Модуль» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества (в комплексе) в составе:

№	Наименование	Инв. №	Общ. пл., кв. м
1	Здание инженерно-бытового корпуса инв. № 98318	640/С-84380	10 378,5
2	Тепловые сети, инв. № 98342	640/С-84368	-
3	Площадка асфальтобетонная (инв. № 98364)	640/С-84443	1612,5
4	Погрузочно-разгрузочная площадка (инв. № 98365)	640/С-84378	783,6
5	Трансформаторная подстанция	640/С-84444	37,7
6	Сети водопровода (инв. № 98340, инв. № 98339, инв. № 98341)	640/С-84373	-
7	Канализационная насосная станция (инв. № 98330)	640/С-84377	25,2
8	Эстакада-площадка для мойки автомобилей	640/С-84445	-
9	Топливно-заправочный пункт (инв. № 98327)	640/С-84371	-
10	Очистные сооружения дождевых стоков (инв. № 98331)	640/С-84365	-
11	Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25301)	640/С-84372	-
12	Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25300)	640/С-84367	-
13	Контрольно-пропускной пункт	640/С-84440	8,1
14	Склад газовых баллонов	640/С-84442	107,8
15	Вспомогательный корпус часть инв. № 98358	640/С-84381	1353,6
16	Объекты благоустройства	640/С-84370	-
17	Главный корпус инв. № 98319	640/С-84382	22 590,0
18	Здание вспомогательного корпуса инв. № 98360	640/С-51701	335,7
19	Склад тяжелых металлов	640/С-39784	634,6
20	Здание склада	640/С-38241	535,9
21	Производственное здание-котельная инв. № 98361	640/С-51700	194,3
22	Гараж со вспомогательным корпусом	640/С-47756	1362,3
23	Здание склада	640/С-38242	2467,1
24	Здание информационно-вычислительного центра	640/С-38243	2393,6
25	Автомонтажный корпус	640/С-39783	8785,1
26	Дренажная насосная станция (инв. № 98329)	640/С-84375	330,6
27	Сети канализации (инв. № 98626)	640/С-84379	-
28	Оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона)		

Указанные объекты расположены на земельном участке площадью **8,4478 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101. Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га. Имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у продавца и организатора аукциона).

Начальная цена с НДС (20 %) **– 7 020 000,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **702 000,00 бел. руб.**). Стоимость снижена на **10 %.**

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель (единственный участник) торгов (покупатель). Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.11.2018.

Аукцион состоится **09.01.2019** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.01.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

В извещении о проведении аукциона по продаже имущества **ОАО «Пуховичский пищекомбинат», опубликованном в газете «Звязда» от 28.11.2018 на стр. 14 вместо даты 29.12.2018 дату аукциона считать 13.12.2018.**

УНП 690324015

ДА ПРЫЁМУ ТУРЫСТАЎ ГАТОВЫ!

У Мінску адбыўся семінар на тэму II Еўрапейскіх гульняў для экскурсаводаў

Гэта мерапрыемства было прызначана для экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, акрэдытаваных Нацыянальным агенцтвам па турызме. У ходзе семінара фондам «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» былі прадстаўлены прэзентацыі па гісторыі Еўрапейскіх гульняў, асаблівасцях спартыўнай і культурнай праграм форуму, турысцка-інфармацыйным забеспячэнні Гульняў. Удзельнікі азнаёміліся таксама з аспектамі бязвізавага ўезду і мытнага рэгулявання, якія выкарыстоўваюцца ў перыяд правядзення II Еўрапейскіх гульняў, і білетнай праграмай.

— Мерапрыемства, арганізаванае Дырэкцыяй II Еўрапейскіх гульняў на базе БДУФК, мае важнае значэнне з пункту гледжання пазіцыянавання нашай краіны і ў прыватнасці Мінска не толькі ў найбліжэйшай, але і ў доўгатэрміновай перспектыве, — заўважыў **Анатоль КОТАЎ, намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года»**. — Важнае яно ў першую чаргу таму, што яго ўдзельнікамі сталі менавіта тыя людзі, якім трэба будзе працаваць з замежнымі турыстамі, што прыедуць у Беларусь у маі — чэрвені наступнага года не толькі атрымаць асалоду ад спартыўных баталій на арэнах II Еўрапейскіх гульняў, але і пазнаёміцца з нашай гісторыяй і культурай. Дарэчы, культурная праграма Гульняў будзе не менш насычанай, чым спартыўная. Таму ўзаемадзеянне з «праваднікамі» ў сферы турыстычных паслуг бачыцца важным кампанентам па падрыхтоўцы сферы турысцкіх паслуг да мультыспартыўнага форуму. У ходзе семінара мы звярнулі ўвагу яго ўдзельнікаў на шэраг спецыфічных нюансаў Гульняў, асаблівасці партрэта спартыўнага балельшчыка, далі рэкамендацыі па пашырэнні экскурсійнай праграмы.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

«СПАКУСА» ЦІ РАДАСЦЬ БОЖАГА ЎЦЕЛАЎЛЕННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адзін чалавек наведаў кляштар і ўбачыў, як манахі з радасцю супольна моляцца і жывуць. Тады ён сказаў: «Якія яны шчаслівыя: могуць забыцца пра ўсе зямныя праблемы, — але потым дадаў: — Аднак яны не могуць пагарджаць грэшным светам, бо і ў яго прыходзіць Бог».

Сапраўды, Бог уцелавіўся больш за дзве тысячы гадоў таму і прыйшоў у наш свет. Але Яго ўцелаўленне працягваецца праз дзейнасць Касцёла, праз нас, праз нашую малітву і працу. Таму Божае Нараджэнне неабходна святкаваць увесь час. Усё наша жыццё — гэта наш Бэтлеем, у якім Бог з намі.

Папскі прапаведнік айцец Раньера Канталямэса, капуцын, прапануе наступнае тэалагічнае тлумачэнне таямніцы ўцелаўлення Бога і збаўлення. Пасля граху Адама чалавек апынуўся ў пастцы злога духа і павінен быў з ім змагацца, каб вярнуць сабе свабоду, аднак не мог яго перамагчы, бо нельга пазбавіцца ад кагосьці, будучы ў яго няволі. Бог, які мог перамагчы злога духа, не меў патрэбы з ім змагацца, таму што не зграшыў. У выніку ў свеце панаваў грэх, які вёў чалавецтва да духоўнай катастрофы.

Чалавек павінен быў змагацца, але не мог перамагчы; Бог мог перамагчы, але Яму гэта не было патрэбна. Такая сітуацыя нагадвала замкнёнае кола. Толькі Хрыстус як сапраўдны Бог і сапраўдны Чалавек, кіруючыся бязмежнай любоўю Бога да грэшнага чалавека, змог разарваць гэтае кола і вывесці чалавецтва з тупіка, у якім яно апынулася. Ён перамог злога духа. Такім чынам праз Хрыста збаўленне прыйшло ў свет.

Бог у чалавечым целе прыйшоў у гэты свет у Бэтлееме. Сёння, пасля дваццаці стагоддзяў, Ён таксама прыходзіць да нас. Да Яго паспяшаліся пастушкі, тры Мудрацы з Усходу, але не пайшлі прывітаць ні кароль Ірад, ні фарысеі, ані магутныя гэтага свету.

А як жа мы самі? Ці гатовыя мы яго прыняць? Мы, людзі XXI стагоддзя, усё больш абмяжоўваючыся сваімі інтарэсамі, пошукам прыемнасцяў, імкненнем да ўлады і багацця, давяраючы дасягненням розуму, развіццю навукі і тэхналогіі, — ці можам мы з пакораю прыняць праўду ўцелаўлення Бога? Ці можам дапусціць, што сярод нас з'яўляецца сам Бог? Гэтыя і падобныя пытанні ўзнікаюць кожны дзень.

Сучасны свет, а асабліва Еўропа, усё больш секулярызуецца, адмаўляецца ад Бога і хрысціянскіх каштоўнасцяў. Прымаюцца супярэчныя Божаму закону і духу Евангелля законы. Не шануецца Богам створаны інстытут сям'і. Самыя новыя дасягненні генетыкі выкарыстоўваюцца для маніпуляцыі з найбольш каштоўным Божым дарам, якім з'яўляецца дар жыцця. Вядзецца прапаганда згубнай гендарнай ідэалогіі, якая адкідае праўду аб тым, што Бог стварыў чалавека як мужчыну і жанчыну (Быц 1, 27), і сцвярджае, што пол чалавека залежыць ад культурных абставін, у якіх ён жыве, і таму можа змяняцца. Гэтым самым яна пераварочвае Богам створаны парадак дагары нагамі. Парушаюцца прынцыпы сацыяльнай справядлівасці. Тэрарызм і гібрыдныя войны становяцца новай пагрозай. Вялікай праблемай з'яўляецца міграцыя. Сучасная культура і СМІ замест таго, каб умацоўваць духоўныя каштоўнасці, іх абвяргаюць.

Свет перажывае нябачаны раней крызіс веры. У імя свецкасці завуаляванa абмяжоўваецца яе публічнае праяўленне, і яна ўсё часцей зводзіцца да прыватнай сферы. Каб не абражаць, маўляў, пачуцці прадстаўнікоў іншых рэлігій ці культур, робяцца спробы стварыць уніфікаваную мадэль жыцця, выкараніць вядомыя і паважаныя ўсімі традыцыі, змяніць іх назвы, сімвалы ці месцы. У выніку разбураюцца асновы веры з мэтай абмежавання яе ў калектыўнай свядомасці; усё зводзіцца да неакрэсленых успамінаў пра традыцыю.

Ці ў такой сітуацыі мы часам не падобныя да людзей, якія ў сінагозе ў Назарэце не хацелі слухаць Езуса? Яны казалі: «Ды хто Ён такі, што нас павучае? Мы ж Яго добра ведаем, Ён сын Марыі і Юзафа» (Мк 6, 1—6). Ці мы не падобныя да слухачоў святога апостала Паўла ў афінскім Арэапагу, якія кпілі з яго, кажучы: «Паслухаем цябе іншым разам» (*Дз* 17, 32)?

Крызіс веры вядзе да крызісу надзеі, які ўсё часцей адчуваецца ў сучасным свеце. Людзі губляюць надзею і перастаюць верыць у сваё вечнае прызначэнне. Свет, які жыве без Бога, не ведае або не хоча ведаць праўды пра тое, што Хрыстус Збаўца даў пачатак новаму стварэнню. Навізна Евангелля заключаецца ў тым, што калі чалавеку здаецца, што ён зрабіў усё магчымае і не змог дасягнуць жаданага выніку, то Бог перамагае, бо для Яго няма рэчаў немагчымых. Неабходна толькі дазволіць Яму дзейнічаць.

Сутнасць праблемы заключаецца ў «спакусе ўцелаўлення»; у шакуючым факце таго, што Бог з'яўляецца сярод людзей у чалавечым целе і ў звычайных абставінах. Уцелаўленне Бога палохае сучасны свет, таму што Бог прыходзіць да кожнага з нас, прыходзіць з чалавечым сэрцам і тварам, каб быць блізка да нас і нагадаць аб Божай праўдзе.

Сёння, калі Збаўца прыходзіць у наш беларускі Бэтлеем, услухаемся ў галасы анёльскіх хораў, якія абвяшчаюць хвалу Богу на вышынях і супакой людзям добрай волі. Яны спяваюць і на нашай зямлі. Паспяшаемся да Яго, як паспяшаліся пастушкі. Станем у цішыні каля ясляў з Немаўляткам Езусам і ў Ім вачыма душы ўбачым Збаўцу, каб «спакуса ўцелаўлення» стала нашай радасцю і каб радасць гэтая была поўнай (*Ян* 15, 11).

Праўда ўцелаўлення Бога заклікае да таго, каб мы сваім хрысціянскім жыццём неслі Хрыста ў наш свет, які мае ў Ім патрэбу. Сапраўднае хрысціянскае жыццё — гэта той шлях, па якім чалавек пакліканы ісці за Богам, а не спадзявацца толькі на дасягненні навукі і тэхналогіі або на гараскопы ў надзеі даведацца пра сваю будучыню. Хрысціянін павінен даверыцца Хрысту, які нарадзіўся ў Бэтлееме і нараджаецца сёння на нашай зямлі, каб прычыніцца да пабудовы свабоднага і маральнага грамадства.

Фундаментальным пытаннем сучаснасці з'яўляецца пытанне, ці ў нас дастаткова волі да захавання хрысціянскай спадчыны? Ці ў нас ёсць жаданне захаваць нашу хрысціянскую цывілізацыю ад знішчэння? Ці ў нас ёсць мужнасць бараніць нашу веру?

Можна мець добра развітую эканоміку, але калі мы не будзем жыць паводле духоўных каштоўнасцяў, то станем слабымі і безабароннымі. Каб быць моцнымі, неабходна адрадзіць духоўную сілу.

Не трэба забывацца пра тое, які вялікі і пазітыўны ўплыў на гісторыю чалавецтва і яго прагрэс аказала хрысціянства; як шмат яно ўнесла ў развіццё навукі і культуры, цывілізацыі любові і жыцця, гуманізму, абароны міру і сацыяльнай справядлівасці і гэтак далей.

Калі мы сустракаемся з новымі выклікамі, праявамі маральнага рэлятывізму і змрочных перспектыў на будучыню, то пачынаем адчайвацца перад цяжарам штодзённага жыцця і не ведаем, як стаць дзейнымі асобамі гісторыі. У той жа час сустрэча з Хрыстом унутрана перамяняе, бо з'яўляецца сапраўднай рэвалюцыяй сэрца, якая здольная павярнуць кола гісторыі. Абуджанае праўдай Божага ўцелаўлення чалавецтва нараджае новых герояў і дапамагае ацэньваць падзеі свету ў святле Евангелля, адрозніваючы дабро ад зла і часовыя прыемнасці ад вечнай радасці.

Дарагія браты і сёстры!

Прыйсце Божага Сына ў асобе чалавека ў наш свет стала пачаткам ажыццяўлення Божага плана збаўлення. У безабаронным Немаўляці праявілася бязмежная Божая любоў, якая не цуралася і па-ранейшаму не цураецца схіліцца над грэшным чалавекам, каб яго выратаваць ад вечнай смерці і даць яму новую надзею.

Святкаванне таямніцы ўцелаўлення Божага Сына дазваляе нам чарговы раз наблізіцца да праўды пра Бога, які хоча быць блізкім да кожнага з нас, які хоча напоўніць святлом сваёй святой прысутнасці нашае жыццё і нашыя справы, якія праз грэх ахінае цемра духоўнай смерці.

Віншую ўсіх вас з Нараджэннем Хрыстовым!

Віншую каталікоў і тых хрысціянаў, якія сёння адзначаюць гэтае свята!

Віншую братоў і сясцёр праваслаўных, якія будуць святкаваць Хрыстова Нараджэнне праз два тыдні!

Віншую ўсіх людзей добрай волі!

Ад усяго сэрца жадаю ўсім вам поўнай супакою духоўнай пілігрымкі ў бэтлеемскую пячору і сустрэчы з Нованароджаным, які выклікае захапленне ад сузірання Яго святога аблічча.

Няхай дзякуючы таямніцы ўцелаўлення Бога наша Айчына стане Бэтлеемам XXI стагоддзя, каб у ёй кожны дзень праз сваю ласку нараджаўся Езус! Няхай Ён адорыць нас сваім супакоем! Няхай узбагаціць новай надзеяй, якая не толькі ў палітычнай ці эканамічнай свабодзе або ў рэформах, але перадусім у Богу! Няхай блаславіць нас і вядзе шляхам Евангелля ў шчаслівую будучыню!

Беларусь, не бойся прыняць Езуса, бо ў Ім наша надзея і шчаслівая будучыня!

Поўных ласкі Пана і Яго супакою свят Божага Нараджэння і шчаслівага Новага года! Усведамленне прысутнасці Слова, Якое «сталася целам і пасялілася між намі» (*Ян* 1, 14) няхай суправаджае нас ва ўсіх нашых ініцыятывах у гэты новы перыяд нашага жыцця!

Раздзяляючы з усімі вамі радасць прыйсця Сына Божага ў свет, на знак еднасці дзялюся традыцыйнай аплаткай. Як яна складаецца з многіх зярнятак, таксама і мы будзьма адзіныя ў Езусе Хрысце, каб нашая радасць была поўнай (*Ян* 15, 11)!

Свае пажаданні ўмацоўваю блаславеннем у імя Айца, і Сына, і Духа Святога. Амэн.

Архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.

Извещение о проведении 9 января 2019 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

Предмет торгов (состав и сведения о продаваемом имуществе)	«Литер А 2/К. Здание административно-хозяйственное (Бытовой комплекс)» общей площадью 629,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-21714; «Литер Б 1/К. Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель (Столярный цех)» общей площадью 2 528,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-21715; «здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, литер Е 1/к» общей площадью 113,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-21719; «здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, литер Ж 1/к» общей площадью 185,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-21718; здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, литер В 1/к общей площадью 139,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-21716; распределительный шкаф СПМ (инв. № 40020А); распределительный шкаф СПМ (инв. № 40025); распределительный шкаф СПМ (инв. № 40027); вводный распределительный щит (инв. № 40028); вводный распределительный щит (инв. № 40030); вводный распределительный щит (инв. № 40031); шлагбаум WILL (инв. № 1877); оборудование котельной (инв. №10002ЦО); забор кирпичный с ж/б эл-ми и сетки-рабицы (инв. № 44); производственная площадка с асфальтовым покрытием (инв. № 37); сети водопроводные стальные (инв. № 857); канализационные сети чугунные (инв. № 859); навес над гильотиной (собственное произв-во) (инв. № 21776); газопровод среднего давления к котельной (инв. № 42109); беседка (инв. № 1668)
Местонахождение продаваемого имущества	г. Минск, ул. Пинская, 28, 28/1, 28/2, 28/3, 28/4
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер – 500000000006000665, площадь – 0,9377 га
Продавец имущества	ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск
Организатор торгов	государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск
Начальная цена предмета торгов с учетом НДС	1 971 438,61 бел. руб.
Сумма задатка	197 000,00 бел. руб.
Условие торгов	Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов
Наличие обременений	Аренда

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

При заключении договора купли-продажи недвижимого имущества ОАО «Минскремстрой» руководствуется своими имущественными интересами, уставом, локальными нормативными правовыми актами Общества, подходами по распоряжению государственным имуществом согласно Указу Президента Республики Беларусь от 4 июля 2012 г. № 294 «О порядке распоряжения государственным имуществом» и другими нормативными правовыми актами Республики Беларусь.

Торги проводятся 9 января 2019 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 26.12.2018 по 08.01.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 226-41-14, (017) 200-04-11, (029) 688-61-94 (ОАО «Минскремстрой»).